# БУК – 25 ГАДОЎ, ФБІС – 55...

Расце і мацнее наш адзіны ў краіне малады і сталы, непаўторны і мудры універсітэт культуры. Яму ўжо 25 гадоў. Разам з ім расце і мужнее факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, які, можна сказаць, стаў асновай для стварэння Беларускага універсітэта культуры, духоўным і інтэлігентным тварам нашай установы.

Вядзе адлік бібліятэчны факультэт з далекіх ваенных часоў, калі Мінск яшчэ ляжаў у руінах, а нашы бацькі і дзяды ваявалі на франтах другой сусветнай вайны. Але дзяржава разумела значнасць і неабходнасць гэтай прафесіі для далейшага інтэнсіўнага развіцця нашай краіны, для станаўлення беларускай дзяржаўнасці і менталітэту.

З кожным годам расце папулярнасць факультэта, умацоўваецца яго аўтарытэт, ствараюцца новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, адпавядаючыя сённяшнім патрэбнасцям грамадства. На чатырох кафедрах факультэта сёння праходзяць падрыхтоўку спецыялісты ў галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, аўтаматызаваных бібліятэчных і інфармацыйных сістэм, маркетынгу і менеджменту бібліятэчнай справы, розных тыпаў бібліятэк: публічных, навукова-тэхнічных, спецыяльных, дзіцячых, па музеязнаўству, музейнай рабоце ў фондах. Апошнімі гадамі распачалася падрыхтоўка студэнтаў па здвоеных спецыяльнасцях: бібліятэказнаўства і беларуская мова і літаратура; кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю, бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова; бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства; бібліятэказнаўства, бібліяграфія старажытнай і рэдкай кнігі і г.д.

На кафедрах факультэта працуюць высокапрафесійныя выкладчыкі – прафесары В.Я.Лявончыкаў, А.П.Грыцкевіч, Л.А.Дзямешка, дацэнты Р.С.Матульскі, У.А.Акуліч, М.А.Яцэвіч, С.В.Зыгмантовіч, С.А.Паулава, Н.А.Ляйко, В.А.Касап, Н.У.Клімянкова і іншыя.

Сістэма шматузроўневай адукацыі дазваляе факультэту планамерна рыхтаваць спецыялістаў высокай кваліфікацыі. Пасля завяршэння навучання лепшыя студэнты паступаюць у гадзічную магістратуру, дзе атрымліваюць неабходныя навуковыя і педагагічныя уменні і навыкі, затым у трохгадовую аспірантуру для авалодання сістэмай навуковых ведаў і напісання дысертацый. Аспіранты-выпускнікі маюць магчымасць абараняць свае навуковыя работы ў Саветах па абароне дысертацый, якія працуюць у нашым універсітэце.

Выкладчыкі, якія маюць вучоныя ступені кандыдата навук, накіроўваюцца для набыцця доктарскай ступені ў дактарантуру універсітэта.

Створаная сістэма шматузроўневай падрыхтоўкі кадраў дае магчымасць для пастаяннага развіцця і ўдасканалення дзейнасці факультэта, выражэння задач забеспячэння рэспубліцы неабходнымі спецыялістамі культуралагічнага профілю.

Хочацца спадзявацца, што факультэт і надалей будзе высока несці універсітэцкую годнасць, адпавядаць званню вядучай вышэйшай навучальнай установы ў галіне культуры, захоўваць і перадаваць нашчадкам багатую духоўную спадчыну беларускага народа, спрыяць духоўнаму развіццю нашага грамадства.

Віншую з юбілеем усіх студэнтаў, выпускнікоў і выкладчыкаў нашага факультэта, добрага шляху і плёну ўсім на жыццёвых перакрыжаваннях.

*Я.Д. Грыгаровіч*






1. На дэманстрацыі. Былыя рэктары Заронак Н.П., Пузікаў В.М. і выкладчыкі кафедры бібліяграфіі і бібліятэказнаўства

2. Сустрэча з амерыканскім паслом Д.Спэкхардам.

3. 1-ы выпуск Мінскага інстытута культуры.







# Да 55-годдзя факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм



БУК
ФБІС











